МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БЕЛОРУССКИЙ КООРДИНАЦИОННЫЙ ЦЕНТР
НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

Библиотека БарГУ
0002 3679

# МАТЕРИАЛЫ
# РЕСПУБЛИКАНСКОЙ НАУЧНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
# УЧАЩИХСЯ И СТУДЕНТОВ БЕЛАРУСИ

**г. Барановичи**
**11 – 12 декабря 2001 года**

**В 2 частях**
**Часть 1**

**Барановичи**
**2001**

УДК 082 (043.2)
ББК 94
М 33

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки РБ А.П. Сманцер; кандидат психологических наук, доцент А.М. Кухарчук

**Редакционная коллегия:** Л.Ф. Мирзаянова (3 направление); Е.И. Бородина (1, 4 направления); Е.И. Пономарева (2 направление); Т.И. Нестерович (4 направление)

**Материалы** республиканской научной конференции учащихся М 33 и студентов Беларуси, Барановичи, 11 – 12 дек. 2001 г.: В 2 ч.– Ч. 1 / Ред. кол.: Л.Ф. Мирзаянова и др.– Барановичи: БГВПК, 2001.– 238 с.

ISBN 985-6616-13-3

В сборнике содержатся статьи участников республиканской научной конференции учащихся и студентов Республики Беларусь.

Материалы теоретического и практико-ориентированного характера могут быть использованы преподавателями вузов, ссузов, учителями школ и студенческой молодежью, интересующейся научно-исследовательской деятельностью.

**ISBN 985-6616-13-3**

**УДК 082 (043.2)**
**ББК 94**
**М 33**

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2001

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

Пламя, взлетающее по деревьям во время лесного пожара, ассоциировалось у древнего человека со змеем. Именно ассоциации со змеем привели к появлению в славянской мифологии Огненного змея. В заговорах Огненный змей призывается как волшебное существо, способное внушить страсть женщине. Здесь проявляется связь огня с чувством. Представления о разрушительной силе огня также нашли своё отражение в словах с любовной семантикой. В этих образах "акцентируется неконтролируемая сила эмоций, их стихийность, спонтанность, независимость от воли и сознания (разума) человека" [2, 291]. Таким образом возникли сочетания с глаголами **подниматься, разрушать, уничтожать, бушевать, разбушеваться, свирепствовать, разыграться, сметать, развеивать.**

Культ огня нашёл своё отражение в семантике русского слова. "Если б мы не знали, что божества огня и света занимали важное место в языческих верованиях славян, то мы могли бы убедиться в этом из обилия слов, имеющих в основании представления огня и света" [3, 289].

Литература


1. Афанасьев А.Н. Живая вода и вещее слово.– М., 1988.
2. Максимов С.В. Нечистая, неведомая и крестная сила.– Кемерово, 1991.
3. Потебня А.А. Слово и миф.– М., 1989.


## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША М. БАГДАНОВІЧА "ПАМІЖ ПЯСКОЎ ЕГІПЕЦКАЙ ЗЯМЛІ..."


А.У. Шлейко, М.В. Швед
(Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж)

Навуковы кіраўнік – В.М. Шавель,
магістр педагагічных навук, старэйшы выкладчык


Максім Багдановіч – натура багата надзеленая ад прыроды, узбагачаная мноствам усебаковых ведаў, паэт бліскучага таленту. Рознабаковым творчым вопытам і скарыстаннем мнагагранных форм і літаратурных стыляў, рытмаў і памераў ён узняў беларускае вершаскладанне на больш высокую ступень.

Сюжэтны апавядальны верш "Паміж пяскоў..." укладзены ў складаную традыцыйную форму санета. Ён напісаны ў 1911 годзе і з'яўляецца паэтычным водгукам на артыкул прафесара Харкаўскага

універсітэта А. Пагодзіна пра беларускіх паэтаў. У вершы М. Багдановіч пры дапамозе сімвалаў і алегорый выказаў веру ў лепшую будучыню свайго краю.

"Санет" строга кананічны: у ім 14 радкоў – дзве чатырохрадковыя і дзве трохрадковыя страфы; рыфма класічная – авваы – авва – ввг – дгд. Традыцыйная форма санета развівае думку ў адным напрамку: пасля экспазіцыі (першая страфа) і пад'ёму (другая страфа) наступае хуткае завяршэнне тэмы, якое знаходзіць найбольш яркае выражэнне ў заключным радку.

Максім Багдановіч гэтую класічную форму напоўніў новым зместам, сцвярджаючы права класічных форм паэзіі на выражэнне самых актуальных праблем сучаснасці. Санетная форма распадаецца на дзве асобныя часткі, што вымагае і ад зместу кожнай з іх як закончанасці, так і незалежнасці. У першых васьмі радках санета адзначаем спакойнае развіццё тэмы – жыццёвай сілы зерня, якое тысячагоддзі праляжала ў магіле, але:

Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

Наступны радок як бы рэзка абрывае развіццё тэмы. Непасрэдны зварот паэта да "забытага краю роднага" публіцыстычны. Пасля яго папярэднія радкі напаўняюцца для чытача новым сэнсам. Жменя засохшых зернейкаў – гэта сімвал неразбуджаных народных сіл:

Вось сімвал твой, забыты краю родны!

Клічная інтанацыя ў канцы сказа – радасць за вынік доўгіх пошукаў сапраўднага сімвала для свайго народа. І зразумела, чаму паэт апісвае менавіта тыя зернейкі, што былі знойдзены ў магіле "паміж пяскоў Егіпецкай зямлі": у далёкія часы егіпцяне лічылі, што чалавек пасля смерці працягвае свой пажыццёвы шлях у царства бессмяроцця, таму нябожчыку трэба было даць у дарогу ўсё неабходнае для яго далейшага там існавання, у тым ліку і зерне. Асабліва незлічонымі багаццямі былі напоўнены грабніцы фараонаў: раскрадаць іх сталі з даўніх часоў. Таму пры пабудове пірамід архітэктары ўзводзілі іх з тайнымі ўваходамі, глухімі дзвярыма – падчас нават на столі – і падземнымі заблытанымі калідорамі і тупікамі. Гэта моцна абцяжарвала працу вучоных і археолагаў, якія спрабавалі дакапацца да грабніц фараонаў, што здзіўляюць увесь свет да нашага часу. Таму зразумела, чаму Багдановіч сімвалам свайго народа абраў зерне з магілы "над хвалямі сінеючага Ніла": яно вытрымала праверку часам і выпрабаваннямі.

Незвычайная архітэктоніка "Санета", іншасказальная ў першай частцы, з адкрытай аўтарскай пазіцыяй у другой, уласцівай звычайна

свабодным вершам сацыяльна-палітычнай накіраванасці, выклікала і своеасаблівую вобразную яго сістэму.

У першай частцы санета мы не бачым вобразных сродкаў мовы. Адзінае параўнанне – у другой частцы верша ("дух народны, маўляў крыніца"). Гэтыя радкі (так званы санетны замок) завяршаюць твор і, як звычайна ў санеце, з'яўляюцца самымі выразнымі па думцы і вобразнасці.

Вобразны падзел на дзве часткі падкрэсліваецца і значнасцю ў іх розных часцін мовы: у першай частцы статычны малюнак ствараецца выкарыстанымі назоўнікамі, а ў другой – дынамічная карціна абуджэння народнага духу – дзеясловамі і дзеяслоўнымі формамі (забыты, зварушаны, веру, не засне, рынецца, мкне, здолеўшы, прабіцца).

Санетная форма вымагае пільнай увагі да кожнага слова. Ні адно слова ў творы М. Багдановіча не ўжываецца болей разу. Паэт знарок выкарыстоўвае звычайныя агульнаўжывальныя словы (зямля, хвалі, гаршчок, насенне і інш.). Аднак дзякуючы рытму радкі верша гучаць урачыста.

На дзве часткі разбіваецца санет і ў інтанацыйным плане: запаволеная інтанацыя ў першых васьмі радках, адчуванне прастору ствараецца выкарыстаннем шматскладовых слоў (Егіпецкай, сінеючага, засохшымі і інш.), ярка выражаным гукапісам галосных ([о], [а]). У апошніх шасці радках мяняецца настрой верша, які падмацоўваецца алітэрацыяй ([р] – краю, родны, зварушаны, нарэшце, народны і інш.).

Наватарства М. Багдановіча ў складаным развіцці думкі: у цэнтры верша – вобраз неўміручага народнага духу, які, з аднаго боку, параўноўваецца з абуджаным да жыцця зернем, а з другога – з вечна жывой крыніцай.

Такім чынам, увесь санет – гэта два разгорнутыя параўнанні, зведзеныя да асноўнай думкі:

Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца…

Знешняя прастата санета ўяўная. На самай справе верш М. Багдановіча – твор выключна складаны па сваёй вобразнай і кампазіцыйнай структуры. Санет сведчыць аб высокім культурным узроўні беларускай паэзіі таго часу, аб вобразна-выяўленчым багацці нашай мовы, якая можа перадаваць самыя тонкія адценні думак і пачуццяў.